# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі Селях Аксаны Аляксандраўны
**"Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20 – 30-я гг. XX ст.",**
прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія

Актуальныя гістарычныя абставіны і грамадскія праблемы істотна пашырылі прадметную вобласць этналагічнай навукі. Так, новыя гарызонты для даследаванняў адчыняе праблематызацыя паўсядзённасці, якая ў беларускай этналогіі атаясамліваецца з паняццямі "традыцыйная культура", "побыт", "лад жыцця", "спосаб жыццядзейнасці". Дысертацыя Селях А.А. з'яўляецца першай у беларускай этналогіі працай, прысвечанай праблеме трасфармацыі паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст. Дагэтуль абраная саіскальніцай тэма на аснове сучаснай гістарычнай метадалогіі спецыяльна не вывучалася.

У працы ўпершыню прадстаўлена комплексная рэканструкцыя асноўных параметраў дзявочай паўсядзённасці ў заходнепалескай вёсцы. Селях А.А. з апорай на багаты фактычны матэрыял былі ахарактарызаваны структуры штодзённасці дзяўчат і іх штодзённыя практыкі, індывідуальнае ўспрыняцце пэўных аспектаў штодзённасці, раскрыты сацыякультурная і гістарычная зададзенасць дзявочага штодзённага жыцця ў заходнепалескай вёсцы.

Прадстаўленая работа – даследаванне дзявочай паўсядзённасці ў этналагічным ракурсе, што было пераканаўча аргументавана Селях А.А. у першай главе, прысвечанай гістарыяграфіі праблемы і тэарэтычна-метадалагічнаму абгрунтаванню даследавання. Зразумела выкладзена і даследчыцкая канцэпцыя.

Метадалагічны інструментар і крыніцавая база даследавання, унушальную частку якой складаюць палявыя матэрыялы, сабраныя асабіста аўтарам, дазволілі выявіць асаблівасці культурнага ландшафту Заходняга Палесся: вызначыць ступень захаванасці і змен у ім. Сам дыскурс паўсядзённасці з'яўляецца найбольш дарэчным індыкатарам сацыякультурных пераўтваральных працэсаў, выяўленне спецыфікі якіх было мэтай прадстаўленага даследавання.

Дысертацыя безумоўна мае навуковую значнасць і каштоўнасць для беларускай этналогіі. Абраная праблема непасрэдна закранае глыбінныя асновы функцыянавання міжпакаленнай культурнай пераемнасці ў заходнепалескай вясковай супольнасці.

Матэрыялы і вынікі дысертацыйнага даследавання ў значнай ступені пашыраюць межы этналагічных ведаў пра рэгіянальныя асаблівасці культуры

заходніх палешукоў. Асаблівую каштоўнасць маюць матэрыялы, якія ахопліваюць найменш даследаваны перыяд другой паловы XX ст.

Найбольш значныя палажэнні і высновы даследавання знайшлі сваё адлюстраванне ў цэлым шэрагу навуковых публікацый. Так, 6 артыкулаў аўтара былі апублікаваны ў навуковых выданнях, уключаных у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў.

Тэарэтычныя высновы і фактычныя матэрыялы дысертацыі знайдуць прымяненне ў абагульняючых працах па этналогіі Беларусі, а таксама могуць быць выкарыстаны ва ўстановах вышэйшай адукацыі пры выкладанні адпаведных курсаў (“Этналогія Беларусі”, “Сацыякультурная антрапалогія”, “Культуралогія”, “Гісторыя паўсядзённасці”).

Дысертацыя Селях Аксаны Аляксандраўны “Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20 – 30-я гг. XX ст.” з’яўляецца завершанай навуковай работай. Асноўныя яе вынікі маюць важнае значэнне для развіцця айчыннай этналагічнай навукі. Праца цалкам адпавядае патрабаванням Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь, якія прад’яўляюцца да кандыдацкіх дысертацый. Аўтар даследавання заслугоўвае прысуджэння ёй ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія.

Кандыдат гістарычных навук,
дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі
і гісторыі мастацтваў
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта І.Г. Бачыла

04.06.2026 г.

ПОДПИСЬ ... УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник ... организационной ... и документационного обеспечения
... Н.Б. Черкасская
«04» 06 2026